# Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускага мовазнаўства”

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0232 -01 Беларуская філалогія<br>Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента<br>Модуль “Гісторыя і дыялекталогія беларускай мовы” |
| **Кароткі змест** | Прадмет і задачы гісторыі беларускага мовазнаўства. Перыядызацыя гісторыі беларускага мовазнаўства. Вывучэнне мовы ў старажытныя часы. Гісторыя развіцця беларускага мовазнаўства часоў старажытнасці. Вывучэнне беларускай мовы ў першай палове ХІХ стагоддзя. Я. Карскі – заснавальнік беларускага мовазнаўства. Лінгвістычная дзейнасць С. Некрашэвіча, М. Байкова, В. Ластоўскага, Я. Бялькевіча, М. Каспяровіча. "Беларуская граматыка для школ" Б. Тарашкевіча. Я. Лёсік як мовазнавец. Развіццё беларускага мовазнаўства ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя.<br>Узнікненне параўнальна-гістарычнага мовазнаўства. Младаграматычны кірунак у мовазнаўстве. Ф. дэ Сасюр як заснавальнік сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі. Сучасная лінгвістыка і інтэрлінгвістыка. Асноўныя паняцці кагнітыўнай лінгвістыкі. Праблемы прыкладной лінгвістыкі. Пытанні мадэлявання мовы ў дзеянні. Камп’ютэрная лінгвістыка. Праблемы інфармацыйна-пошукавых аспектаў прыкладной лінгвістыкі. Сацыялінгвістыка. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:** гісторыю развіцця граматычнай думкі ва ўсходніх славян старажытнай пары; асноўныя этапы і напрамкі гісторыі мовазнаўства; асноўныя працы вучоных, якія даследавалі пытанні розных мовы; бібліяграфічныя агляды і даследаванні айчынных і замежных лінгвістаў; **умець:** карыстацца асноўнай і дадатковай літаратурай па дысцыпліне; вылучаць асноўныя перыяды гісторыі замежнага і беларускага мовазнаўства, характарызаваць існаваўшыя ў розныя часы лінгвістычныя школы і напрамкі; прасачыць эвалюцыю навуковых ведаў, аналізаваць працы пра беларускую мову, створаныя на розных этапах развіцця беларускага мовазнаўства;д аваць ацэнку асноўным праблемам і прынцыпам метадалогіі лінгвістычных даследаванняў традыцыйным і больш новым метадам вывучэння мовы;<br>Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцыі:<br>БПК-9 Характарызаваць этапы станаўлення і развіцця беларускай лінгвістыкі, вызначаць ролю і месца айчынных і замежных даследчыкаў беларускай мовы, характарызваць із уклад ў гісторыю беларускага мовазнаўства. |
| **Прэрэквізіты** | Сучасная беларуская мова, гісторыя беларускай літатарурнай мовы |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне – 108 (3 заліковыя адзінкі). Колькасць аўдыторных гадзін – 52, з іх лекцыйных – 32, практычных – 20. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 7 семестр, тэставыя заданні, залік. |